**Тэма:** Цотныя і няцотныя функцыі.

**Мэта:** мяркуецца, што да канца ўрока навучэнцы будуць правільна выкарыстоўваць тэрміны і ўжываць паняцці цотнасць і няцотнасць функцыі; умець вызначаць цотнасць і няцотнасць функцыі на прадуктыўным і творчым узроўнях.

**Задачы:**

- стварыць умовы для замацавання ведаў і адпрацоўкі ўменняў па тэме “Цотныя і няцотныя функцыі”;
- садзейнічаць развіццю лагічнага мыслення матэматычнай мовы, навыкаў адэкватнай самаацэнкі;
- стварыць умовы для развіцця культуры зносін праз работу ў групах.

**Тып урока:** замацаванне новага матэрыялу.

**Ход урока**

**1.Арганізацыйна-матывацыйны этап**

- прывітанне;
- праверка дамашняга задання.

**2. Этап актуалізацыі апорных ведаў**

- Якія са сцвярджэнняў з’яўляюцца правільнымі, а якія не (прыём “Так –Не”?:

- Кожная функцыя з’яўляецца цотнай або няцотнай. (Не).
- Графік няцотнай функцыі сіметрычны адносна восі ардынат. (Не.)
- Калі абсяг вызначэння функцыі не сіметрычны адносна пачатку каардынат, то такая функцыя не можа быць ні цотнай, ні няцотнай. (Так).
- У цотнай функцыі заўсёды цотны лік нулёў. (Не).
- Існуе функцыя цотная і няцотная адначасова (Так).

**3.Этап мэтавызначэння**

- На папярэднім уроку мы пазнаёміліся з такой уласцівасцю функцыі як цотнасць. Заданні, якія мы выконвалі па тэме, у большай ступені мелі адносіны да графікаў. Сёння нам неабходна пазнаёміцца і выканаць заданні, якія звязаны з паняццем “цотнасць” і “няцотнасць” у выпадках, калі функцыя зададзена аналітычна. Як вы думаеце, якімі будуць мэты нашага ўрока?

**4. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

У жыцці вельмі важна знаходзіць аналогіі і на іх аснове рабіць высновы. Матэматыка гэтаму вучыць. Выкарыстоўваючы ўзоры, якія прапанаваны ў табліцы вучэбнага дапаможніка на с.109, разважаючы па аналогіі, паспрабуйце выканаць практыкаванні на вызначэнне цотнасці і няцотнасці функцый, зададзеных аналітычна.

Абмяркоўваючы ў групах (па 2 парты), навучэнцы выконваюць практыкаванні з вучэбнага дапаможніка № 2.97 ( б, г), № 2.99(в, б), № 2.102(б,г), № 2.103 і агучваюць вынікі. Настаўнік у выпадку неабходнасці выступае ў ролі кансультанта і прапануе ў кожным выпадку вызначыць месцы самых распаўсюджаных памылак.

**5. Кантроль і карэкцыя ведаў**

Навучэнцы самастойна выконваюць заданні выхаднога кантролю (практыкаванні № 2.97(а), № 2.99(а), № 2.102(а)), выконваюць самаправерку па ўзоры, запісаным да ўрока на адваротным баку дошкі ці выведзеным на экран.

**6. Рэфлексія і падвядзенне вынікаў**

Прадоўжыце сказы:

- *На гэтым уроку я зразумеў…*
- *На гэтым уроку я навучыўся…*
- *На гэтым уроку ў мяне атрымалася…*

**7. Дамашняе заданне**

Раздзел 2. § 8, № 2.114, № 2.116, № 2.119, творчая частка дамашняга задання № 2.107*.